ПАД МІРНЫМ НЕБАМ БЕЛАРУСІ

# СВЯТА СА СЛЯЗАМІ НА ВАЧАХ



**7 мая грамадска-літаратурная акцыя Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ «Пад мірным небам Беларусі» адбылася ў гродзенскай сярэдняй школе № 38 імя Кірылы Тураўскага. З гучным чытаннем аўтарскіх твораў з нагоды 81-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне тут выступілі члены Саюза пісьменнікаў Беларусі Вольга Алізар, Андрэй Татур і Дзмітрый Радзівончык.**



У актавай зале на сустрэчу з гродзенскімі паэтамі сабраліся навучэнцы старэйшых класаў, педагогі, прадстаўнікі адміністрацыі школы. Трэба сказаць, што ў пісьменнікаў Гродна склаліся цёплыя сяброўскія стасункі з 38-й школай. Тут нам заўсёды рады ўжо шмат гадоў; як ганаровых гасцей прынялі і сёння. Гаспадары падрыхтавалі насычаную канцэртную праграму, якая натхніла і зблізіла прадстаўнікоў розных паклаенняў, стварыла ўзнёслы, урачысты настрой. Гасцям вельмі цікава было пазнаёміцца са школьнымі традыцыямі – цырымоніяй унясення дзяржаўнага сцяга, ганаровай вартай; можна было з хваляваннем паназіраць за тым, як тут успрымаюць роднае мастацкае слова, ставяцца да творчасці аўтараў, якіх на старонках падручнікаў не знойдзеш. І хваляванне перарасло ў радасць ад сустрэчы. Тым больш, што моладзевая аўдыторыя слухачоў была падрыхтаванай і сапраўды зацікаўленай. Выступленні ўспрымаліся з увагай, суправаджаліся шчырымі апладысментамі. Заслугоўвае самай высокай ацэнкі арганізацыя мерапрыемства. Гэта вынік сумеснай працы настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, сапраўдных руплівцаў культурных традыцый беларускага народа, энтузіястаў творчага ладу жыцця, развіцця духоўнага патэнцыялу юных беларусаў,– нашага даўняга сябра Жанны Антонаўны Івашкевіч і яе калегі Таццяны Уладзіміраўны Канаплянкі. Нізкі ім паклон!

Перадсвяточная творчая акцыя абласной пісьменніцкай арганізацыі пад назвай «Пад мірным небам Беларусі» адбылася ў гродзенскай сярэдняй школе № 38 імя Кірылы Тураўскага ў форме літаратурнай гасцінай на сцэне актавай залы. Паэты павіншавалі гаспадароў з самым галоўным і дарагім святам для ўсіх сапраўдных беларусаў – Днём Перамогі, пажадалі, каб неба над нашай сінявокай Радзімай заўсёды было мірным. На беларускай і рускай мовах прагучалі творы ваенна-патрыятычнай лірыкі на тэмы славы героям-пераможцам фашызму, вечнай памяці ахвярам Вялікай Айчыннай вайны, генацыду беларускага народа, а таксама трагічнага лёсу дзяцей вайны…

Акрамя паэтычных твораў, былі прачытаныя і публіцыстычныя тэксты – нарысы-успаміны, звязаныя з жудаснымі падзеямі вайны сямейныя хронікі. У прамовах літаратараў гучаў заклік ніколі не забываць пра неўміручы подзвіг савецкага народа, не дапускаць скажэнняў гістарычнай праўды, быць годнымі свяшчэннай памяці нашых слаўных ветэранаў, любіць нашу Радзіму, берагчы мір… У фінале мерапрыемства літаратары падарылі школе летась выданы абласной пісьменніцкай арганізацыяй зборнік ваенна-патрыятычнай паэзіі «Память огненных лет» і пакінулі ў ім памятны надпіс. Паэтам таксама вельмі прыемна было атрымаць падарункі ад удзячных слухачоў. Мерапрыемства, якое нікога не пакінула абыякавым, скончылася сумесным выкананнем песні «Дзень Перамогі» і фотасесіяй на памяць.

Прысвечаная 81-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне грамадска-літаратурная акцыя Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ «Пад мірным небам Беларусі» працягваецца.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** грамадска-літаратурная акцыя «Пад мірным небам Беларусі», яе ўдзельнікі і арганізатары. Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 38 імя Кірылы Тураўскага г. Гродна». 7 мая 2026 года.








**ДЛЯ ДАВЕДКІ.** Грамадска-літаратурная акцыя «Пад мірным небам Беларусі» была ініцыяваная Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі ў 2015 годзе. Яна праходзіць з удзелам пісьменнікаў у форме творчых сустрэч, вечароў паэзіі, публічных літаратурных мерапрыемстваў ваенна-патрыятычнай і грамадзянскай тэматыкі ў розных дзяржаўных установах г. Гродна і Гродзенскай вобласці. Мэты акцыі – з дапамогай мастацкага слова аддаць даніну памяці і пашаны ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, савецкаму народу-пераможцу фашызму, выказаць удзячнасць за магчымасць сёння жыць пад мірным небам; прыцягнуць увагу прадстаўнікоў розных пакаленняў да недапушчальнасці паўтарэння жахаў вайны.



Выступае член СПБ, паэтэса Вольга Алізар



Выступае член СПБ, паэт Андрэй Татур




Школе ўручаецца кніга, калектыўны паэтычны зборнік «Память огненных лет» (2025)




ОБЩЕСТВЕННО-
ЛИТЕРАТУРНАЯ АКЦИЯ
«ПАД МІРНЫМ НЕБАМ
БЕЛАРУСІ»








*Злева направа:* Д. М. Радзівончык, Т. У. Канаплянка, В. С. Алізар, Ж. А. Івашкевіч, А. А. Татур




ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

БЕЛАРУСІ